














в

ва



ва́за

во



воўк



ву



ву́чні

вы



вы́мпел



в

ві



ві́лы

ве



ве́ер




вя



вясёлка

вё



вёска

Назаві́ сем ко́лераў вясёлкі.



с л м а і ы у ў г п т о э р ч н

| | | | |
|---|---|---|---|
| Віта́лій | Вале́рый | Ві́ктар | Васі́лій |
| Віталі́на | Вале́рыя | Вікто́рыя | Васілі́на |

## Выста́ва малю́нкаў

У нас лісты́, ало́ўкі і .

Мы ма-ля-ва́-лі,
ма-ля-ва́-лі
і на-ма-ля-ва́-лі!





Іва́н намалява́ў а-ква́-ры-ум.
Васі́лій намалява́ў вёску і во́зера.
Варва́ра намалява́ла ва́зу і звано́чкі.
Вікто́рыя намалява́ла со́нейка і вясёлку.
Гэ́та выста́ва малю́нкаў.



!! Чые́ гэ́та малю́нкі?





Гэ́та малю́нак Ва́ры? Гэ́та малю́нак Ві́кі?





Гэ́та малю́нак Ва́ні? Гэ́та малю́нак Ва́сі?

к й я ю е ё з в



Правообладатель Академия образования

| | | |
|---|---|---|
| экску́рсія | запуска́лі | вы́-пра-ві-лі-ся |
| экспана́ты | запланава́лі | па-зна-ё-мі-лі-ся |

## У Мі́нску

Ра́нкам ма́ма, та́та, Варва́ра і Віта́лій вы́правіліся ў Мі́нск. Яны́ запланава́лі экску́рсію ў музе́й гісто́рыі вайны́.

У музе́і ма́ма, та́та, Варва́ра і Віта́лій пазнаёміліся з ро́знымі экспана́тамі. По́тым усе ра́зам гуля́лі па па́рку Перамо́гі. Та́та і сын запуска́лі па-ве́-тра-на-га зме́я.

Пасля́ экску́рсіі ў Мі́нск засталі́ся прые́мныя ўспамі́ны.



с л м а і ы у ў г п т о э р ч н

## По́мнікі геро́ям

У нас мно́га по́мнікаў во́інам, які́я загі́нулі ў вайну́. У свя́ты тут мно́га кве́так і вянко́ў, гром салю́таў. Сла́ва во́інам! Мы па́мятаем геро́яў!



Ма-ну-ме́нт Перамо́гі ў Мі́нску



Курга́н Сла́вы каля́ Мі́нска



Які́я по́мнікі во́інам-геро́ям у тваі́м кра́і?





Ве́рачка і ма́ма каля́ Ве́чнага агню́.

к й я ю е ё з в



Правообладатель Академия образования